

ТУРЫЗМ ПА-ДЗЯТЛАЎСКУ 2

НА МАШЫНЕ — ЗА ЗАЙЦАМ 13



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

31 САКАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 61 (29941)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Падчас Паслання народу і парламенту заўсёды цікава пачуць меркаванне кіраўніка дзяржавы па ўсіх пытаннях. Што датычыцца сферы МАРГ, у мінулым годзе Прэзідэнтам было дадзена важнае даручэнне забяспечыць увядзенне новай сістэмы цэнавага рэгулявання. Сістэма ўведзена і даказала сваю эфектыўнасць, даручэнне выканана. Упэўнены, што выкананне сацыяльнага кантракта паміж уладай і народам і зараз будзе ў фокусе ўвагі Прэзідэнта нашай краіны».*

# Касмічныя канікулы



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Другакласнік сталічнай школы № 164 Кірыл ПОМАЗАЎ разам з бацькам прыйшоў у касмічны парк прыгод для дзяцей і дарослых «Касмадрайв», які пачаў працаваць акурат на вясенніх канікулах. Цікаўных хлапчукоў тут вабіць усё. Асабліва трэнажоры, падобныя на тыя, на якіх трэніруюцца сапраўдныя лётчыкі і касманаўты.**

## КОРАТКА

• Гандлёвыя сеткі прадоўжылі 10-працэнтную зніжку на шэраг тавараў для ўразлівых катэгорый насельніцтва.

• **ФПБ праводзіць маніторынг выкарыстання прадукцыі стабфондаў.**

• АДКБ на тэрыторыі Беларусі ў 2023 годзе плануе правесці пяць вучэнняў.

• **Міжнародны эканамічны форум пройдзе ў Віцебску 18 і 19 мая.**

• Конкурс на прэмію ўрада за дасягненні ў галіне якасці аб'яўлены ў Беларусі.

• **Аршанскі льнокамбінат і курскі «Саюзтэкстыль-СТ» запусцяць сумесную вытворчасць нятканых матэрыялаў.**

• У лесанасенным цэнтры ў Івацэвічах будуць вырошчваць больш сеянцаў з закрытай каранёвай сістэмай.

• **Краіны АДКБ узгаднілі план аперацыі па супрацьдзеянні незаконнай міграцыі.**

ISSN 1990 — 763X

23061>

9 771990 763008

Клімат

## РЭГІЯНАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ «РУХАЕЦЦА» Ў НАС У ТРЫ РАЗЫ ХУТЧЭЙ

**Ужо на працягу 4—5 дзесяцігоддзяў на нашай планеце назіраецца глабальны працэс змянення клімату. Як гэтыя змены закранаюць Беларусь, што змянілася за апошнія дзесяцігоддзі для нашай краіны, расказала начальнік аддзела вывучэння змен клімату службы метэаралагічнага і кліматычнага маніторынгу, фонду даных Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Наталля КЛЯВЕЦ.**

### Планета награваецца

Прыкладна пачынаючы з 1970—1980-х гадоў стала відавочна, што павышаецца глабальная прыземная тэмпература паветра. Але, як падкрэсліла Наталля Клявец, высновы аб змяненні клімату робяцца не толькі на згаданай падставе. Сусветная метэаралагічная арганізацыя вядзе назіранні за такімі параметрамі, як рост узроўню Сусветнага акіяна, рост канцэнтрацыі парніковых газаў, скарачэнне плошчы палярных ільдоў і іншае.

Існуе шмат тэорый сучаснага змянення клімату. Большасць кліматолагаў у свеце робіць выснову аб антрапагенным характары пацяплення, звязанага з ростам канцэнтрацыі $CO_2$, метану і іншых парніковых газаў у атмасферы. Адзначаецца ўздзеянне дзейнасці чалавека на кліматычную сістэму, што прыводзіць да змен клімату. СТАР. 4

Дом з гісторыяй

## СЯДЗІБА, ШТО ЗАЧАКАЛАСЯ ГАСПАДАРА

**Старадаўнюю сядзібу ў Ганцавіцкім раёне прадаюць з пачатковым коштам у адну базавую велічыню**

**Гэта не сцены з дахам, не руіны на падмурку, а цалкам прыстойны дом, з вокнамі і дзвярамі, з электрычнасцю, каналізацыяй, а самае галоўнае — з гісторыяй, бо ўзведзены больш за сто гадоў таму. І тэарэтычна ён можа быць прададзены за 37 рублёў. Таргі прызначаны на заўтра.** СТАР. 3





Грамадзянская супольнасць

# Бачыць свой удзел у палітычным жыцці краіны

## У беларусаў ёсць такая патрэба

**У краіне працягваецца плённая работа над умацаваннем Беларускай партыі «Белая Русь». Актыўны ўдзел у гэтым працэсе прымаюць і дэпутаты. Члены Палаты прадстаўнікоў разам са старшынёй грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Алегам РАМАНАВЫМ абмеркавалі далейшыя крокі па пабудове партыі і яе ўмацаванні ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Вялікае значэнне ў гэтым мае і стварэнне рэгіянальных аддзяленняў партыі. Па словах Алега Раманава, дэпутаты могуць прасоўваць ідэі партыі ў сваіх рэгіёнах. Многія прадстаўнікі дэпутацкага корпуса выказалі жаданне стаць членамі партыі, некаторыя дэпутаты былі ініцыятарамі яе стварэння.**

Алег Раманаў паведаміў, што ўнутрыпалітычны савет партыі будзе дыферэнцыраваны. «Мы прапануем нашым калегам членства ў камісіях па адпаведных напрамках. Акрамя таго, партыя будзе рэалізоўваць праекты рознай накіраванасці. І праз праектную работу мы будзем імкнуцца да дасягнення тых мэт, якія закладзены ў праграме», — адзначыў ён. Алег Раманаў падкрэсліў, што ідэі, увасобленыя ў Статуце партыі, неабходна давесці да ўсіх слаёў беларускага грамадства. І дэпутаты могуць зрабіць гэта лепей за ўсіх.

Старшыня грамадскага аб'яднання расказаў, што цяпер праводзіцца актыўная зверка даных, якія прадстаўлены заснавальнікамі. Адрпацоўваюцца падпісныя лісты, якія даслалі з рэгіёнаў. Гэтая работа зойме яшчэ каля тыдня. Па словах Андрэя Раманава, да канца наступнага тыдня яна будзе завершана, і поўны пакет дакументаў пададуць у Міністэрства юстыцыі для праверкі і рэгістрацыі.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА** падкрэсліў, што стымулам да актывізацыі партыйнага будаўніцтва і аб'яднання здаровых палітычных сіл для ўдзелу ў дзяржаўным будаўніцтве сталі вынікі рэферэндуму 2022 года і наступныя за ім заканадаўчыя пераўтварэнні. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгралі і прыняцце законаў аб асновах грамадзянскай супольнасці, змяненне Выбарчага кодэкса і іншых заканадаўчых актаў, якія і фарміруюць аснову для дзейнасці палітычных партый. «У сувязі з гэтым з'яўленне новых партый, актывізацыя і падрыхтоўка да перарэгістрацыі дзеючых — гэта працэс, які дазваляе актывізаваць найлепшыя сілы грамадства на цывілізаванае заканадаўчае ўрэгуляванне ўдзелу ў палітычным жыцці нашай краіны», — адзначыў парламентарый. Ён нагадаў, што ГА «Белая Русь» у 2004 годзе ўтварылася ў Гродзенскім рэгіёне. Валянцін Семяняка расказаў, што быў адным з першых членаў арганізацыі, удзельнікам і арганізатарам розных праектаў, якія вельмі добра зарэкамендавалі сябе ў беларускім грамадстве і ў рэгіёнах. Таму, па яго словах, стварэнне партыі на аснове грамадскага аб'яднання — знакавы момант. «Гэта сусветная практыка, калі палітычная партыя ствараецца на базе грамадскага аб'яднання і падсілкоўваецца выходзячы з дзеянняў аднаго ці некалькіх грамадскіх аб'яднанняў. Гэта цывілізаваны шлях, вельмі правільны і дакладны. І тое, як ідзе гэты працэс, гэта яшчэ раз пацвярджае», — падкрэсліў Валянцін Семяняка.

**Член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Іна КРАЧАК** узначальвае пярвічную арганізацыю Аршанскага раённага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Яна расказала, што ў Аршанскім раёне адбыліся ўстаноўчыя сходы, прайшоў устаноўчы з'езд партыі. Па яе словах, маладая партыя выклікае вялікую цікавасць у жыхароў Аршанскага раёна. «Мы спадзяёмся, што гэта партыя стане масавай і людзі будуць не на кухні абмяркоўваць праблемы, якія іх хвалююць, а на партыйных пляцоўках. Партыя павінна стаць выканаўчай палітычнай сілай. У жыхароў Аршанскага раёна ўжо ёсць вялікая цікавасць, і на ўстаноўчых сходах ужо хацелі ўступіць у партыю», — падкрэсліла яна.

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Ірына ДАЎГАЛА** растлумачыла, чаму пытанні партыйнага будаўніцтва цікавяць насельніцтва. Па яе словах, у грамадзян нашай краіны ёсць патрэба бачыць свой удзел у палітычным жыцці грамадства. І тое, што цяпер большасць беларусаў з'яўляюцца членамі грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і плануюць стаць членамі адпаведнай партыі — таму пацвярджэнне.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Рэгіёны

# «ЧЫМ БОЛЬШ ПАГЛЫБЛЯЕМСЯ Ў ГІСТОРЫЮ, ТЫМ БОЛЬШ УЗНІКАЕ ІДЭЙ»

## У Дзятлаўскім раёне вядзецца распрацоўка ўласнай турыстычнай мадэлі развіцця тэрыторый

**Адным з самых вядомых тут называюць «Зецельскі фэст» — свята, прысвечанае сям'і. Гэта, можна сказаць, брэнд раёна. Але дзятлаўчане працягваюць шукаць новыя магчымасці па прыцягненні турыстаў. Ці стане раён прывабным для шырокага кола беларусаў і нават замежнікаў? Думкамі пра гэта падзяліўся старшыня Дзятлаўскага райвыканкама Андрэй САДОЎСКІ.**



***— Андрэй Уладзіміравіч, раскажыце, калі ласка, пра «Зецельскі фэст».***

— Фестывалю сёлета будзе шэсць гадоў, ён яшчэ даволі малады, але яго папулярнасць расце. Гэта свята, якое скіравана на захаванне сямейных традыцый, у ім шмат конкурсаў, імпрэз для сямейнага адпачынку. З году ў год расце колькасць яго ўдзельнікаў. Калі ў першым фэсце бралі ўдзел 11 сем'яў, то цяпер ужо больш за 50. У гэты дзень у горадзе шмат гасцей. Праграма фестывалю насычаная і разнастайная. Тут і кірмаш рамеснікаў, і гульнявыя атракцыёны, і вулічная кухня, і многае іншае. Гэта сапраўднае свята сям'і.

***— Чым яшчэ цікавы раён для турыстаў?***

— Дзятлаўшчына пакуль маладвядомая ў турыстычным сегменце. Разам з тым яна багатая сваёй гісторыяй, нам ёсць што паказаць і чым здзівіць. Найчасцей турыстычныя аўтобусы спыняюцца на цэнтральнай плошчы райцэнтра каля каталіцкага храма XVII стагоддзя і былога палаца Радзівілаў. Вядома, гэта не ўсе нашы славутасці. Усяго ў склад 15 распрацаваных турыстычных маршрутаў уваходзіць 55 аб'ектаў.

Дзякуючы санаторыям «Радон» і «Альфа Радон» актыўна развіваецца аздараўленчы турызм. Таксама карыстаюцца папулярнасцю сплавы на байдарках. У дадзеным кірунку распрацаваны водныя маршруты «Па хвалях Моўчадзі», «Шчара — рака партызанская», «Прынёманскія краявіды». Ёсць цікавы камбінаваны водна-пешы тур з элементамі анімацыі «Ад Цара да самавара».

***— Ці ёсць у раёна пэўная канцэпцыя развіцця турыстычнай сферы?***

— Мы працуем над стварэннем сваёй турыстычнай мадэлі з выкарыстаннем мясцовых рэсурсаў. Іх нямала. Гэта і цікавыя гістарычныя мясціны, ландшафты, культурныя традыцыі, рэдкая флора — наведванне будзе ажыццяўляцца рознымі відамі транспарту, у тым ліку і камбінаваным.

***— Якія новыя маршруты гатовыя здзівіць турыстаў?***

— Летась у Нацыянальным агенцтве па турызме быў атэставаны наш новы маршрут «Дарогамі Дзятлаўшчыны», тады ж у лістападзе на рэспубліканскім семінары адбылася яго прэзентацыя. У яго ўвайшлі аб'екты паасобку вядомыя турыстам, але мы вырашылі аб'яднаць іх у адзіную сетку. Гэта паклонныя валуны, археалагічнае гарадзішча «Талерка», анёл з Неапаля, сабор, які будаваўся сто гадоў, адзін з элементаў дугі Струвэ і многае іншае.

Таксама мы ўрачыста адкрылі маршрут «Партызанскай сцежкай па Ліпічанскай пушчы». Маршрут мае турыстычную маркіроўку па міжнародных стандартах, суправаджаецца QR-кодамі, што дазваляе вандраваць без экскурсавода.

***— Ёсць яшчэ патэнцыял для ўвасаблення новых праектаў?***

— Ёсць шмат задумак. Напрыклад, цяпер займаемся распрацоўкай новага гісторыка-пазнавальнага турыстычнага маршруту «На ўскрайку Ліпічанскай пушчы, альбо Накрышская гісторыя». Ёсць ідэя стварыць турыстычны кластар «Легендамі сівой даўніны. Род Стравінскіх». Калісьці род валодаў гэтымі мясцінамі.

Цікавы экалагічны праект датычыцца развіцця заказніка «Ліпічанская пушча». Ён уключае адразу пяць «зялёных» маршрутаў, якія распрацаваны сумесна з Дзятлаўскім лясгасам у рамках плана развіцця заказніка да 2026 года. Усе маршруты для вандроўкі на роварах, падчас якой можна ўбачыць розныя віды раслін і жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу, напрыклад, гнёзды шэрага жураўля. Са спецыяльных вышак можна будзе весці назіранні, займацца фотапаляваннем. Будуць устаноўлены знакі інфармацыйнай і турыстычнай навігацыі.

Бачым перспектыву ў развіцці гастранамічнага турызму. У такую работу ўключылася даволі шырокае кола грамадскасці. Напрыклад, школьнікі займаюцца вывучэннем страў сваіх продкаў, музей бярэ на сябе рэалізацыю міні-праекта «Жыццё продкаў праз адкрыццё свету беларускай кухні». Вынікам такой сумеснай работы павінен стаць выпуск «Кулінарнай энцыклапедыі Дзятлаўшчыны». Гэта даволі маштабная праца, прычым з практычным працягам. Найлепшыя і найбольш характэрныя для нашых мясцін рэцэпты будуць прапанаваны ў меню рэстарана «Ліпічанка».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 1 красавіка, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 226 99 26;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Віктаравіч ДУРНОЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЯНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Таццяна Мікалаеўна ШАЎЦОВА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч ЧЭРНІКАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Карупцыя ў Вялікабрытаніі падчас пандэміі ўзрасла ў чатыры разы



Маштабы карупцыі ў дзяржаўным сектары Вялікабрытаніі ўзраслі з £5,5 млрд ($6,7 млрд) у 2018—2019 і 2019—2020 фінансавых гадах да £21 млрд ($25,6 млрд) у 2020—2021 і 2021—2022 гадах. Аб гэтым паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на справаздачу Нацыянальнага кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення (NAO), перадае ТАСС. «Назіраецца значнае павелічэнне колькасці ашуканскіх схем у гадавых справаздачах, якія мы правяраем», — цытуе агенцтва кіраўніка NAO Гарэта Дэвіса. Рэальная лічба можа быць нават вышэйшая: па выніках 2020—2021 фінансавага года ўпраўленне па барацьбе з махлярствам у дзяржаўным сектары выявіла ў бюджэце нястачу ў памеры каля £58,8 млрд ($ 71,7 млрд), не лічачы выдаткаў, звязаных з пандэміяй. Міністр фінансаў Вялікабрытаніі Джэрэмі Хант у адказ на вынікі праверкі падкрэсліў, што барацьба з карупцыяй пры аказанні бізнесу дзяржаўнай дапамогі з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў палітыкі ўрада. Намеснік кіраўніка апазіцыйнай Лейбарысцкай партыі Анджэла Рэйнер заявіла, што «цяперашні ўрад поўнасцю грэбуе сваімі абавязацельствамі па барацьбе з гэтым відам злачынстваў».

## Талібы пачалі кампанію па знішчэнні опіумнага маку на захадзе Афганістана

Супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з наркотыкамі правінцыі Герат, што на захадзе Афганістана, пачалі кампанію па барацьбе з культываваннем маку. Пра гэта паведаміў афганскі тэлеканал TOLO news са спасылкай на праваахоўнікаў. «Наша аперацыя працягваецца, сотні акраў зямлі ачышчаны ад маку ў розных раёнах», — цытуе канал начальніка ўпраўлення па барацьбе з наркотыкамі Герата Хаятулу Рухані. Як паведаміў TOLO news, кампанія па знішчэнні макавых палёў стартавала незадоўга да пачатку сезона збору ўраджаю. Адзначаецца, што супрацоўнікаў упраўлення па барацьбе з наркотыкамі суправаджаюць сілы спецыяльнага прызначэння. Нягледзячы на тое, што 3 красавіка мінулага года вярхоўны лідар «Талібана» Хайбатула Ахундзада сваім указам забараніў вырошчванне ў Афганістане опіумнага маку, выкарыстанне і транспарціроўку ўсіх відаў наркотыкаў, а таксама гандаль імі, вытворчасць наркатычных рэчываў у краіне толькі павялічылася. Паводле абнародаваных 1 лістапада даных Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці (ЮНОДК), аб'ём вытворчасці опіумнага маку ў Афганістане ўзрос на 32 працэнты ў параўнанні з 2021-м. У дакладзе ЮНОДК адзначалася, што Афганістан пакрывае 80 працэнтаў ад сусветнага попыту на опіум.

## Жывога ката дасталі з-пад завалаў праз 49 дзён пасля землетрасення ў Турцыі

Двухгадовага брытанскага ката па мянушцы Хан дасталі з-пад завалаў 11-павярховага дома ў раёне Анікішубат горада Мараш, які абрынуўся 6 лютага пасля другога землетрасення магнітудай 7,6, паведаміў Bianet. Гаспадыні гадаванца і яе дачцэ ўдалося выбрацца з будынка пасля першага землетрасення, аднак выратаваць Хана жанчыны не змаглі. Застаўшыся без даху над галавой, турчанка пражыла каля руін дома яшчэ каля 40 дзён, спадзеючыся, што Хан выжыў і яго ўдасца знайсці. Калі жанчына ўжо амаль страціла надзею, яе ката знайшоў уладальнік будынка, які спрабаваў выцягнуць з-пад завалаў кухонную тэхніку. Цяпер Хан знаходзіцца на лячэнні: у ката моцнае абязводжанне і пералом лапы. Аднак ветэрынар спадзяецца, што жывёлу атрымаецца выратаваць.

Дзяржаўны інтарэс

# ІДЭІ, ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАДАЧЫ І ПЛАНЫ НА БУДУЧЫНЮ

## Моладзь дзвюх краін абмеркавала стварэнне адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы

**Унікальнай падзеяй назваў Кангрэс маладых вучоных Беларусі і Расіі дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ.**

Мерапрыемства аб'яднала каля 500 маладых даследчыкаў з навуковых арганізацый і вышэйшых навучальных устаноў дзвюх краін — прадстаўнікоў Нацыянальнага даследчага цэнтра «Курчатаўскі інстытут», Расійскай акадэміі навук і шэрагу яе рэгіянальных навуковых цэнтраў, аддзяленняў і інстытутаў, а таксама Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзясяткаў вядучых ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў нашай краіны.

Навуковае мерапрыемства прайшло напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Гэта не проста супадзенне: навука ўяўляе з сябе наймагутнейшы інтэграцыйны складнік, таму і галоўная тэма кангрэса была сфармуляваная наступным чынам — «Маладыя вучоныя: задачы і напрамкі ўзаемадзеяння для стварэння адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Беларусі і Расіі».

— Што для кожнага з вас навука? Проста работа, руціна, магчымасць атрымліваць заробак? — звярнуўся Дзмітрый Мезенцаў да прысутных на форуме навуковай моладзі. — Ці ўсё ж такі магчымасць быць датычнымі да вялізнага патэнцыялу нацыянальнай навукі, магчымасць шукаць і перамагаць, заявіць пра сябе і зрабіць сваю краіну мацнейшай? Маладыя вучоныя, якія яшчэ ўчора працавалі ў рамках сваіх лабараторый, навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў, сёння разам звяраюць планы і ідэі дзеля рэальных сектараў эканомікі, эканамічнай інтэграцыі, тэхналагічнай незалежнасці і высокай канкурэнтаздольнасці нашых дзяржаў.


Фота БелТА.

Ён зрабіў акцэнт на супрацоўніцтве вучоных Беларусі і Расіі ў фармацэўтыцы, высокіх тэхналогіях, космасе, аграсектары, гуманітарных навуках: «Мы з вялікай павагай кажам пра тое, што ў Беларусі быў захаваны навукова-вытворчы патэнцыял. Гэта заслуга кіраўніка беларускай дзяржавы і шматтысячнага атрада вучоных, якія працуюць у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

Дзмітрый Мезенцаў паведаміў, што больш як 80 мільярдаў расійскіх рублёў было выдаткавана на 82 праграмы Саюзнай дзяржавы ў галіне космасу, электронікі і мікраэлектронікі, аховы здароўя, адукацыі, машынабудавання, абароны і бяспекі. Сёлета ўводзяцца чатыры новыя праграмы Саюзнай дзяржавы: тры з іх — у сферы абароны і бяспекі, адна — у сферы мікрабіялогіі.

— Кангрэс маладых вучоных — не проста знакавае мерапрыемства па лініі навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва нашых краін, — падкрэсліў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Барыс ГРЫЗЛОЎ.** — Дадзены форум ставіць перад навуковай супольнасцю Саюзнай дзяржавы канкрэтныя практычныя задачы па стымуляванні новых даследаванняў, стварэнні спрыяльных умоў для інавацыйных перспектыўных распрацовак у ключавых галінах — ад фізікі да фармацэўтыкі. Вынікі гэтых пошукаў знаходзяць сваё прымяненне ў рэальным сектары эканомікі Расіі і Беларусі, укараняюцца ў прамысловасці, IT-галіне і сельскай гаспадарцы, паскараюць працэсы імпартазамяшчэння і ў рэшце рэшт дадуць нам магчымасць забяспечыць тэхналагічны суверэнітэт.

Асабліва важна, што ў такой маштабнай рабоце ўдзельнічаюць маладыя даследчыкі, бо менавіта яны ў найбліжэйшыя гады будуць задаваць тэндэнцыі ў развіцці навукі.

Барыс Грызлоў паведаміў, што 27 сакавіка па выніках пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы было падпісана міжурадавае пагадненне аб навукова-тэхнічным і інавацыйным супрацоўніцтве, якое надасць новы імпульс узаемадзеянню ў згаданай сферы.

Ужо цяпер вядуцца работы па 20 сумесных праектах у самых запатрабаваных галінах. «Гаворка ідзе ў першую чаргу аб машынабудаванні і электроніцы. Пры гэтым мы пашыраем гарызонт планавання і гаворым ужо не проста аб правядзенні сумесных прыкладных даследаванняў, але і аб рэалізацыі маштабных праектаў узроўню «мегасаенс». Сведчанне таму — адкрыццё філіяла Курчатаўскага інстытута на базе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (яно адбылося ў рамках кангрэса. — **Аўт.**).

— Навука ў Беларусі, як і ў Расіі, здольная вырашаць прыярытэтныя задачы любой складанасці па шырокім коле праблем, — у гэтым упэўнены **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Напрыклад, беларуская навука мае сёння кампетэнцыі нават у тых сферах, дзе раней ніколі іх не мела: гэта космас, атамная энергетыка, штучны інтэлект, кампазіты, высокія тэхналогіі ў IT, біясферы, нанасферы. Мы нават прысутнічаем у Антарктыдзе. У шэрагу даследаванняў нашы ідэі і падыходы не маюць аналагаў у свеце. У нас дзейнічаюць дарожныя карты супрацоўніцтва з Расійскай акадэміяй навук, Нацыянальным даследчым цэнтрам «Курчатаўскі інстытут», Аб'яднаным інстытутам ядзерных даследаванняў у Дубне, навукова-даследчым цэнтрам «Сколкава». У Беларусі цяпер адаптаваны ўсе найлепшыя сусветныя практыкі, якія забяспечваюць высокую прадукцыйнасць даследаванняў і прамую сувязь навукі і вытворчасці.

Уладзімір Гусакоў адзначыў, што ў Нацыянальнай акадэміі навук, як і ўвогуле ў краіне, функцыянуе зладжаная і эфектыўная сістэма работы з моладдзю, якая ахоплівае ўсе сферы яе інтарэсаў: ад асабістай самарэалізацыі да творчых памкненняў і ўдасканалення прафесійных кампетэнцый. У акадэмічным асяроддзі назіраецца прыкметнае амаладжэнне навуковага патэнцыялу. Штогод у акадэмічныя інстытуты і навукова-практычныя цэнтры прыходзіць больш як 300 маладых даследчыкаў з кола выпускнікоў ВНУ. І калі сярэдні ўзрост работнікаў акадэміі яшчэ нядаўна перавышаў 60 гадоў, то сёння ён складае 46 гадоў. Доля даследчыкаў ва ўзросце да 29 гадоў вырасла за апошнія пяць гадоў з 18 да 30 працэнтаў, з іх 15 працэнтаў — гэта маладыя кандыдаты навук. У НАН дзейнічае вельмі эфектыўны праект «Вучоны пад ключ» — разгалінаваная сістэма прэміравання маладых даследчыкаў, ёсць імянныя стыпендыі, штогод папаўняецца банк «100 маладых талентаў НАН Беларусі», а магчымасці зарабляць дадаткова практычна неабмежаваныя (праз дагаворы з прадпрыемствамі, міжнародныя гранты, гранты па тэматыцы канкрэтных лабараторый і гэтак далей). Паспяхова вырашаюцца і праблемы з забеспячэннем жыллём. Новая форма прафарыентацыі і агітацыі за прафесію вучонага — стварэнне маладзёжных акадэмій у розных галінах навуковых ведаў і прыцягненне ў іх рамках да навуковай дзейнасці школьнікаў і студэнтаў.

**Варта дадаць, што рашэнне аб правядзенні Кангрэса маладых вучоных было прынята ў снежні мінулага года прэзідэнтамі Беларусі і Расіі Аляксандрам Лукашэнкам і Уладзімірам Пуціным. Арганізатарам форуму выступіў Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы. Адным з важных вынікаў работы Кангрэса стане фарміраванне ў хуткім часе сумесных маладзёжных навуковых калектываў дзвюх краін, якія будуць працаваць разам над важнымі навуковымі праблемамі.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СЯДЗІБА, ШТО ЗАЧАКАЛАСЯ ГАСПАДАРА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Вядома, да сядзібы трэба прыкласці рукі і ўкласці сродкі, пэўна, немалыя. Але ж сама аўра маёнтка, архітэктура, гісторыя таго вартыя. І мясціна там надзіва маляўнічая. Новы гаспадар зможа адрадзіць дом пад жыллё, зрабіць гасцініцу ці яшчэ які аб'ект. Гэта ж лепш, чым ён будзе стаяць і разбурацца.



Паводле некаторых дакументаў, сядзібу ў Агарэвічах узвялі ў 1911 годзе. Ёю ў розныя гады валодалі розныя гаспадары, напрыклад, будавалі дом Свяжынскія, перабудоўвалі ўжо Апацкія. У кнізе Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны» чытаем: «...Дом пабудовы другой паловы XIX стагоддзя дабудоўваўся ў 1911 годзе. Сядзіба ўключала сядзібны дом на 11 пакояў, два флігелі, парк, водную сістэму, гаспадарчыя пабудовы. Закладзеная на роўнай мясцовасці, мае сіметрычна-восевую кампазіцыю. На галоўнай восі размешчана алея з таполі белай. Уезд аформлены невялікай брамай з двух каменных пілонаў, завершаных канічнымі дахамі. Дом аднапавярховы з высокім дахам, да ўсходняга фасада прыбудаваная паўратонда з зімовым садам. На парадным фасадзе размешчаны ганак на чатырох калонах».

Паводле апісання Федарука, цікава былі выкананы парк, сістэма вадаёмаў. Словам, была невялікая, дакладна спланаваная, утульная сядзіба. Але ў 1939 годзе напаткаў яе незайздросны лёс: сядзібу часткова разрабавалі, гаспадыню саслалі ў Сібір.

Праўда, у 1990-х гадах маёнтак адрамантавалі, тут з'явілася гасцініца. У 1994 годзе ў Агарэвічах прымалі конныя спаборніцтвы. Мясцовая гаспадарка займалася конегадоўляй, абсталявала іпадром. Кажуць, што на скачкі зазіралі вельмі нават высокія госці.

Але ж Федарук называе тую рэканструкцыю крайне няўдалай: «Сядзіба страціла асноўныя сядзібныя рысы, дом прыняў выгляд катэджа, на месцы вадаёма ўладкавалі танцпляцоўку»...

Добра, аднак, ужо і тое, што не дапусцілі канчатковага занядбання. Доўгі час гаспадаром сядзібы было сельгаспрадпрыемства, якое ў гістарычным будынку размясціла сталовую для работнікаў. Ды з часам гаспадарцы стала нявыгадна ўтрымліваць такі аб'ект. Два гады таму сядзібу перадалі на баланс аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама. Таму прадаўцом выступае названы аддзел. Перш чым справа дайшла да аўкцыёну, аддзел працягла час займаўся падрыхтоўкай дакументаў. Прынялі аб'ект фактычна з адной паперай, у якой значылася: «Панскі дом». Але ўвесь падрыхтоўчы этап нарэшце пройдзены, пакет дакументаў, уключаючы праект ахоўнай зоны, атрыманы, і новы ўласнік выстаўляе аб'ект на таргі.

Ахвотных не знайшлося, другая спроба з паніжэннем цаны да 60 тысяч таксама не стала паспяховай, не прадалі аб'ект і за 31 тысячу, ды вось цяпер выстаўляюць за адну базавую.

Лот уключае ў сябе тры штучныя сажалкі, а таксама парк. Амаль два з паловай гектара зямлі аддаецца ў арэнду на 30 гадоў новаму гаспадару пасля здзелкі.




**Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Віктар СУПРУН** расказаў карэспандэнту, што сядзіба выстаўляецца ўжо чацвёрты раз. Першапачатковы стартавы кошт складаў 161 тысячу рублёў. Вядома, пераможца таргоў павінен узяць на сябе абавязацельства беражлівага стаўлення да помніка гісторыі і культуры — захаваць аўтэнтычнасць, асаблівасці архітэктурнай пабудовы.

У Ганцавіцкім раёне гэта адзіная такая сядзіба. І тут скарысталіся магчымасцю, якую дае Указ Прэзідэнта Беларусі № 330 «Аб распараджэнні маёмасцю», які ўступіў у сілу літаральна некалькі дзён таму — 23 сакавіка. Згодна з гэтым дакументам, паявілася магчымасць продажу аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці з коштам адна базавая велічыня.

Віктар Супрун расказаў, што таргі будуць электронныя, заяўкі на ўдзел прымае камітэт «Брэстаблмаёмасць», таму ў Ганцавічах не ведаюць, колькі канкрэтна пададзена заявак. Але ж з улікам таго, што прыязджала паглядзець дом нямала патэнцыйных пакупнікоў, дапускаюць, што ўдзельнікаў збярэцца не менш чым паўдзясятка. Абсалютная большасць з іх — жыхары нашай сталіцы. Так што таргі абяцаюць быць цікавымі, а лічбы — значна перавысіць адну базавую.

Можа, на гэты раз пашанцуе сядзібе: дачакаецца яна свайго часу, каб стаць прывабным аб'ектам для турызму альбо ўтульным домам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота з адкрытых крыніц.**

# РЭГІЯНАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ «РУХАЕЦЦА» Ў НАС У ТРЫ РАЗЫ ХУТЧЭЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але не варта забываць і аб натуральных ваганнях клімату, якія праяўляюцца як на глабальным, так і на рэгіянальным узроўні. Напрыклад, у 2015 годзе адзначалася адна з самых моцных за ўсю гісторыю назіранняў кліматычных з'яў — Эль-Ніньё. Гэтая з'ява разам з антрапагенным уздзеяннем прывялі да таго, што менавіта 2015-ы ў свеце і на тэрыторыі Беларусі быў адным з самых цёплых.

Ёсць і іншыя версіі. Напрыклад, паводле тэорыі літасферных пліт, вялікія плошчы сушы, якія знаходзяцца ў палярных шыротах, спрыяюць паніжэнню сярэдняй тэмпературы паветра па зямным шары. А вялікія плошчы сушы ў экватарыяльных зонах — наадварот, павышэнню тэмпературы. Але, зыходзячы з гісторыі развіцця нашай планеты, дадзеная тэорыя з'яўляецца спрэчнай.

Змены клімату праяўляюцца, у першую чаргу, у росце тэмпературы паветра, павелічэнні паўтаральнасці хваль цяпла, змяншэнні ападкаў у адны месяцы года і росце ў іншыя, павелічэнні паўтаральнасці такіх небяспечных з'яў надвор'я, як высокія тэмпературы паветра, рост інтэнсіўнасці ліўневых ападкаў і інш. Гэтыя з'явы ўплываюць на стан прыродных сістэм, эканоміку і насельніцтва.

Згодна з дакладам міжурадавай групы экспертаў па пытаннях змянення клімату, нават сярэдняе глабальнае пацяпленне прывядзе да таго, што 6 % насякомых, 8 % раслін і 4 % пазваночных жывёл страцяць больш за палову сваіх кліматычна абумоўленых геаграфічных арэалаў пры павышэнні тэмпературы паветра на 1,5 градуса.

Ужо цяпер адзначаюцца выпадкі ўварвання ў тундру дрэвападобных кустоў. Лясы ўмеранага пояса схільныя да рызыкі дэградацыі. З-за росту тэмператур паветра і дэфіцыту ападкаў у асобныя месяцы могуць узнікаць засушлівыя ўмовы, што можа прывесці да харчовага крызісу на планеце. Вырашэнне праблемы патрабуе рацыянальнага кіравання зямельнымі рэсурсамі.

**У апошнія дзесяцігоддзі вялікая ўвага аддаецца рэгіянальнай кліматалогіі, паколькі стала ясна, што ў кожным рэгіёне маюцца свае асаблівасці, якія не заўсёды адпавядаюць глабальным тэндэнцыям.**

## З холаду — у спякоту

Калі параўнаць хуткасць росту тэмпературы паветра на тэрыторыі Беларусі з 1976 да 2021 года, то яна ў тры разы перавышае сярэднюю хуткасць за гэты ж час па зямным шары. Такая ж тэндэнцыя адзначаецца на тэрыторыях суседніх дзяржаў. «Рост сярэдняй тэмпературы па зямным шары ўжо перавысіў адзнаку ў 1 градус у параўнанні з даіндустрыяльным перыядам. А на тэрыторыі нашай краіны тэмпература расце значна хутчэй», — звярнула ўвагу прадстаўнік Белгідрамета.

Лінейны трэнд сярэднегадавой тэмпературы паветра (1976—2021 гады) для тэрыторыі Беларусі склаў 0,60 °С за10 гадоў, што перавышае хуткасць росту тэмпературы паветра па зямным шары больш чым у тры разы і ў два разы вышэй ад хуткасці тэмпературы паветра на сушы ў Паўночным паўшар'і.

Прыкметны рост тэмпературы паветра ў Беларусі пачаў адзначацца з 1981—1990 гадоў. Сярэдняя тэмпература склала плюс 6,3 градуса.



Фота БелТА.

**У ноч з 27 на 28 лютага ў Беларусі можна было ўбачыць палярнае ззянне.**

«Самыя халодныя дзесяць гадоў за ўсю гісторыю метэаназіранняў прыйшліся на 1939—1948 гады з сярэдняй тэмпературай плюс 5,2 градуса. А самым цёплым дзесяцігоддзем было апошняе — з 2013-га да 2022 года — з сярэдняй тэмпературай плюс 8 градусаў», — дадала Наталля Клявец. У цэлым адзначаецца тэндэнцыя, што кожнае наступнае дзесяцігоддзе цяплейшае за папярэдняе. Ужо цяпер сярэднегадавая тэмпература паветра ў нашай краіне на 1,7 градуса вышэйшая за тэмпературную норму ў рэгіёне.

Максімальны рост гадавой тэмпературы адзначаецца па поўдні і ўсходзе Беларусі, па поўначы яна расце меншымі тэмпамі. Ёсць і сезонныя адрозненні: сярэдняя тэмпература расце вялікімі тэмпамі ў халодны перыяд года і крыху больш павольна павялічваецца ў цёплы перыяд. У маі і кастрычніку змен практычна не адзначаецца.

## Дзе залье, а дзе і высушыць

Па словах Наталлі Клявец, у Беларусі фіксуецца невялікае павелічэнне сумы ападкаў. Але гэтыя змены не такія значныя, як у выпадку з тэмпературай паветра. У апошнія дзесяць гадоў сума ападкаў была блізкая да нормы. Тут, аднак, ёсць рэгіянальныя адрозненні. Так, па паўночным захадзе, захадзе, паўднёвым захадзе і ў цэнтральных частках краіны адзначаецца невялікае змяншэнне гадавых сум ападкаў, нягледзячы на агульную тэндэнцыю. А на астатняй тэрыторыі Беларусі, наадварот, фіксуецца рост. Назіраюцца і ўнутрыгадавыя адрозненні: у халодны перыяд года сума ападкаў павялічваецца, а ў асобныя месяцы цёплага перыяду адзначаецца зніжэнне іх колькасці. Асабліва экстрэмальнымі становяцца гэтыя паказчыкі, калі недахоп ападкаў адзначаецца ў пачатку і сярэдзіне летняга перыяду.

У Беларусі расце колькасць гарачых дзён у годзе — з тэмпературай паветра плюс 25 градусаў і вышэй. Змяняецца працягласць сезонаў. З году ў год скарачаецца зіма і становіцца ўсё больш доўгім лета. Расце працягласць вегетацыйнага перыяду, ацяпляльнага ж — скарачаецца. Атрымліваецца, што клімат у нас становіцца мякчэйшым, і гэта для нашай эканомікі карысна, але... Такое пацяпленне можа суправаджацца занадта высокімі тэмпературамі.

«У нас павялічваецца колькасць небяспечных з'яў, звязаных з высокімі тэмпературамі паветра. У цёплы перыяд мы ўсё часцей адзначаем небяспечныя тэмпературы, якія дасягнулі адзнакі плюс 35 градусаў і вышэй. Таксама павялічылася паўтаральнасць небяспечных хваль цяпла», — адзначыла Наталля Клявец.

Паводле яе слоў, 58 % небяспечных з'яў, якія адзначаны на тэрыторыі краіны за апошнія дзесяцігоддзі, нанеслі шкоду галінам эканомікі і насельніцтву. З іх найбольшая ўдзельная вага прыпадае на вельмі моцны вецер і вельмі моцныя дажджы і ліўні, далей ідзе моцная спякота і буйны град.

## Зімы не будзе?

Як вядома, у 2015 годзе каля 200 краін прыняло Парыжскае пагадненне — дакумент, які заклікае ўвесь свет удзельнічаць у барацьбе са змяненнем клімату. Для гэтага трэба не дапусціць росту глабальнай сярэдняй тэмпературы больш як на 2 градусы за кошт скарачэння выкідаў парніковых газаў, утрымаць пацяпленне ў межах 1,5 градуса. Беларусь у ліку першых у Еўрапейскім рэгіёне і трыццатая ў свеце ратыфікавала Парыжскае пагадненне і распачала яго рэалізацыю. Краіна плануе знізіць да 2030 года выкіды парніковых газаў не менш чым на 35 % ад узроўню 1990-га.

«Калі, нягледзячы на ўсе намаганні сусветнай супольнасці, глабальная тэмпература павысіцца да адзнакі ў 1,5 градуса, то, па прагнозах, у Беларусі зімовы сезон стане цяплейшы на тры градусы, а летні — на два градусы. А калі будзе перавышана глабальная адзнака ў два градусы, гэтыя працэсы будуць праходзіць яшчэ больш інтэнсіўна», — адзначыла Наталля Клявец.

Згодна з кліматычным прагнозам, бягучыя тэндэнцыі ў змяненні клімату ў найбліжэйшыя гады захаваюцца. Спецыялісты чакаюць павелічэння колькасці гарачых дзён, паўтаральнасці хваль цяпла і засушлівых перыядаў, а таксама зімовых адліг.

Змяненне клімату выклікае як адмоўныя, так і станоўчыя наступствы з пункту гледжання вынікаў сельскагаспадарчай вытворчасці, падкрэсліваюць аграметэаролагі. «Ваганні ўраджайнасці ў залежнасці ад умоў надвор'я з'яўляюцца аб'ектыўнай рэальнасцю. Нягледзячы на агульнае пацяпленне клімату ў краіне, мы ўсё роўна застаёмся зонай досыць рызыкоўнага земляробства», — сказаў **начальнік аддзела аграметэаралогіі службы гідралогіі і аграметэаралогіі Алег КЛІНЦЭВІЧ.**

Ён назваў істотныя становучыя бакі змен клімату. Перш за ўсё гэта больш працяглы вегетацыйны перыяд і рост забяспечанасці цяплом, што стварае больш спрыяльныя ўмовы для вырошчвання шэрагу культур. Такім чынам, у пэўных межах рост цеплазабяспячэння спрыяе пашырэнню і паляпшэнню структуры раслінаводства. У той жа час узмацняецца экстрэмальнасць клімату за кошт росту максімальных тэмператур паветра, павелічэння працягласці гарачых перыядаў, нарастае паўтаральнасць засух і засушлівых з'яў.

«Тэндэнцыя пацяплення ў зімовы перыяд таксама неадназначная. Зімы прыкметна пацяплелі і скараціліся, што спрыяльна для перазімоўкі раслін, пладовых дрэў і кустоў. Пры гэтым не выключаны і праблемы, звязаныя з аслабленнем загартоўкі раслін, магчымым павелічэннем верагоднасці іх пашкоджання ад перападаў тэмператур (вяртання халадоў), паколькі снежнае покрыва няўстойлівае», — звярнуў увагу начальнік аддзела аграметэаралогіі Белгідрамета.

У Беларусі прымаюцца меры для адаптацыі сельскай гаспадаркі да змен клімату. У структуры пасяўных плошчаў павялічваецца доля больш цеплалюбівых і засухаўстойлівых культур. У групе збожжавых культур усё часцей аддаецца перавага азімым, якія здольныя ў максімальнай ступені выкарыстоўваць восеньскія і вясновыя запасы глебавай вільгаці і менш пакутуюць ад летняй засухі, чым яравыя. Значна павялічыліся пасяўныя плошчы кукурузы на зерне, рапсу на насенне, укараняецца ў вытворчасць азімы ячмень, сеюць сою. Павялічваюцца плошчы вырошчвання сланечніку, агародніннага гарошку, цукровай кукурузы, спаржавай фасолі. Актыўна развіваецца садоўніцтва. Усё большую цікавасць выклікае вырошчванне зусім нетрадыцыйных для Беларусі культур: вядуцца работы па пашырэнні плошчаў вырошчвання бахчавых, ствараюцца прамысловыя плантацыі вінаграду.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НАПЕРАДЗЕ МОЦНЫ ВЕЦЕР І ГАЛАЛЁДЗІЦА

## На наступным тыдні накрые холад паўночных шырот

**Вось жа адыходзячы сакавік нажартаваўся — ён запомніцца нам няўстойлівым і кантрасным надвор'ем. Цёплыя дні змяняліся снежнымі і марозным надвор'ем. У апошні тыдзень месяца паўднёвы цыклон вярнуў сапраўды зімовае надвор'е. Пад уплывам актыўных франтальных раздзелаў у краіне прайшлі снег і дажджы. У большасці раёнаў былі моцныя ападкі, узмацненне ветру да моцнага парывістага, месцамі кружыла мяцеліца, адзначалася наліпанне мокрага снегу. У апошні дзень сакавіка чарговая сістэма франтальных раздзелаў з Заходняй Еўропы прынясе ў Беларусь новыя порцыі ападкаў, а тэмпература паветра будзе блізкая да нормы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы, па поўначы з мокрым снегам. У асобных раёнах слабы галалёд, месцамі на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 6 градусаў па ўсходзе да плюс 6 градусаў па захадзе. Удзень паветра прагрэецца да 3—9 цяпла, па захадзе — да плюс 10—14 градусаў.

У першы дзень красавіка на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы, уначы па паўночным усходзе з мокрым снегам. Прагназуецца складанае надвор'е, калі месцамі туман, ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 0 — плюс 7 градусаў, удзень — 7—13 цяпла. У паўднёвых і заходніх раёнах прагназуецца плюс 14-15 градусаў.

Складаныя ўмовы надвор'я на дарогах захаваюцца і ў нядзелю. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны выпадуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах слабы галалёд і туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад нуля да 7 цяпла, днём ад плюс 2 градусаў па поўначы і да 11 градусаў з плюсам па поўдні і паўднёвым усходзе.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку новага працоўнага тыдня паветраныя патокі зменяць свой напрамак, і ў Беларусь пачнуць паступаць халодныя няўстойлівыя паветраныя масы паўночных шырот.

У панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Уначы тэмпература паветра складзе ад мінус 6 градусаў па паўночным захадзе да плюс 4 градусаў па паўднёвым усходзе краіны. Удзень чакаецца 1—7 градусаў вышэй за нуль.

Чарговая хваля холаду накрые нас у аўторак і сераду. У гэтыя дні месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (у асноўным снег, мокры снег), слабая мяцеліца. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад мінус 6 градусаў да плюс 1 градуса, а пры праясненнях — да 8 марозу. Удзень чакаецца ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ИНФОРМАЦИЯ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ПО АКЦИЯМ

1. Полное наименование и местонахождения акционерного общества: **открытое акционерное общество «Стройтрест № 1» Республика Беларусь, г. Минск, ул. Платонова, д. 15.**

2. Дата принятия решения годового общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям: **27.03.2023 г.**

3. Дивиденды, начисленные на одну акцию (указывается по простым и привилегированным акциям (типам привилегированных акций): **0,5472833236 рубля.**

4. Сроки и порядок выплаты дивидендов по акциям: **до 22 апреля 2023 года.**

**Дивиденды выплачиваются на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финансового отдела Первомайского района г. Минска, акционерам – физическим лицам – почтовыми переводами, акционерам – юридическим лицам – на расчетный счет организации.**

УНП 100288960

Кіно на выхадныя

# ДЛЯ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН

**Аповед пра тое, як цаной жыцця сапраўднага прафесіянала быў выратаваны цэлы горад, чакае гледачоў падчас паказу фільма «Справа для сапраўдных мужчын», знятага ў 1983 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм». Убачым яго на тэлеканале «НТБ-Беларусь» у суботу 1 красавіка.**



Сам рэжысёр кінаработы Валерый Панамароў неяк распавядаў, што першапачаткова сцэнарый будучага фільма быў не самым моцным, але пасля ён адшукаў у газеце гісторыю пра тое, як пад Баранавічамі знайшлі склад з нямецкімі фугасамі. І калі стваральнікі будучай кінастужкі адшукалі людзей, якія працавалі тады, гісторыя для экрана набыла новыя фарбы і акцэнты. Па сюжэце драма разгортваецца ў ваколіцах рачнога порта аднаго з беларускіх гарадоў, дзе хлопчыкі знаходзяць склад нямецкіх боепрыпасаў, якія захаваліся там з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Каб выратаваць насельніцтва, людзей з горада эвакуіравалі і да справы падключылі сапёраў. У працэсе правядзення аперацыі высвятляецца, што міны начынены нервова-паралітычнай атрутай. Чаго цяпер будзе каштаваць выратаванне жыццяў гараджан?..

Варта адзначыць, фільм стаў экранным дэбютам заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Генадзя Давыдзькі (які тады быў акцёрам Купалаўскага тэатра). Галоўная роля афіцэра-сапёра Антона Фралова, які ўвасобіў вобраз чалавека адданага справе і воінскаму доўгу, што гераічна праявіў сябе ў надзвычайных абставінах, стала для акцёра ўдачай, а яе выканаўца надоўга палюбіўся і запомніўся глядацкай аўдыторыі.

**Алена ДРАПКО,**
**фота з сайта belarusfilm.by.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 188

З 10 да 12 сакавіка на базе адпачынку «Прывал» (Гродзенскі р-н) праходзіў адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці вядомага шашачнага кампазітара і трэнера Міхаіла Стэфановіча.

Яго першая шашачная канцоўка была апублікавана ў газеце «Савецкая Беларусь» яшчэ ў чэрвені 1965 г. З таго часу ў розных выданнях было надрукавана каля 1200 кампазіцый самабытнага кампазітара.

Як шашачны трэнер ён «зацягнуў» у свет шашак шмат дзяцей, ёсць сярод яго выхаванцаў і шашысты высокага ўзроўню.

У галоўным турніры сярод 37 удзельнікаў перамог міжнародны майстар з Ваўкавыска Арцём Ціханаў. У юнацкім турніры сярод 17 удзельнікаў першым стаў Мікіта Гутман (Гродна).

Прапануем для вырашэння кампазіцыі М. Стэфановіча.

№ 46



**№ 46**

**Белыя простыя:** c1, e1, d2, f2, a3, e3, g3, f4, g5, h6 (10)

**Чорныя простыя:** b4, d4, h4, a5, c5, e5, b6, d6, e7, h8 (10)

**№ 47**

**Белыя простыя:** c1, g1, d2, b4, h4, c5, a7 (7)

**Чорныя простыя:** c3, e3, d4, f4, a5, h6, e7, g7, f8 (9)

**№ 48**

**Белыя простыя:** e1, e3, a5, e5, g5, b6, f6, h6 (8)

**Чорныя простыя:** c3, b4, a7, дамкі: a1, d8 (5)

**№ 49**

**Белыя простыя:** d2, h4, d6, c7, дамкі: e5 (5)

**Чорныя простыя:** f2, b4, b8, f8, дамкі: a3 (5)

У сакавіку шашачны юбілей малой дошкі (64 гады) адзначыў майстар спорту Вадзім Булат, сёння прапануюцца яго праблемы на вялікай дошцы.

**№ 50**

**Белыя простыя:** 31, 32, 33, 28, 30, 23, 24, 25 (8)

**Чорныя простыя:** 35, 26, 17, 14, 7, 8, 9, 10 (8)

**№ 51**

**Белыя простыя:** 49, 50, 41, 43, 44, 39, 26, 28, 21, 6 (10)

**Чорныя простыя:** 45, 35, 24, 16, 17, 19, 12, 13, 14, 1 (10)

**№ 52**

**Белыя простыя:** 47, 41, 37, 40, 32, 34, 35, 24 (8)

**Чорныя простыя:** 36, 25, 17, 18, 19, 12, 13, 7 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Дадзены старт 22 чэмпіянату Беларусі па шашачнай кампазіцыі ў шашкі-64. Удзельнікі да 10 мая 2023 г. па шэсць кампазіцый у пяці раздзелах «мініяцюры», «праблемы», «дамачныя праблемы», «эцюды» і «бразільскія шашкі» высылаюць на адрас каардынатара: Шульга Віктар, 220051, г. Мінск-51, а/с 52. E-mail: shulga.checkers@gmail.com

**Праверце свае рашэнні:**

**Выпуск № 187** ад 17.03.2023.

№ 42 1. a5-b6 c7:c3 2. c5-b6 a7:c5 3. g1-h2 g5:e7 4. h2:f8 h4-g3 5. f8-c5 g3-h2 6. c5-g1+ 7. h2:f4 h4-g3 8. f4:h2+

**№ 43** 1. h6-g7 f8:f4 2. f2-e3 f4:d2 3. e1:c7 b8:d6 4. a7-b8 d6-e5 5. b8:f4 a3-b2 6. f4-c1 b2-a1 7. c1-h6 a1:g7 8. h6:f8 h8-g7 9. f8:h6+

**№ 44** 1. d2-e3 f4:d2 2. h2-g3 c5:e3 3. a3:c5 d6:b4 4. b6-c7 d8:b6 5. h6-g7 f6:h8 6. g3-f4 e3:g5 7. h4:e1+

**№ 45** 1. 47-41 31:11 2. 33-28 23:43 3. 48:30 36:47 4. 30-25 47:20 5. 25:01+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва —Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013;*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# АД ПАРТРЭТА АСОБЫ ДА ВОБРАЗА ПАКАЛЕННЯ

**На наступным тыдні 4 красавіка спаўняецца 95 гадоў з дня нараджэння актрысы тэатра і кіно, педагога, спявачкі, народнай артысткі СССР Эліны Быстрыцкай. З нагоды знамянальнай даты ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала пакажуць мастацкі фільм «Дабравольцы» з удзелам артысткі і выпуск праграмы «Легенды кіно» пра яе.**



Кінастужка «Дабравольцы» з'явілася ў 1958 годзе. У сваім акцёрскім складзе яна сабрала такіх артыстаў, як Міхаіл Ульянаў, Пётр Шчарбакоў, Людміла Крылова, Леанід Быкаў і іншыя. Зняў яе рэжысёр Юрый Ягораў па аднайменным аўтабіяграфічным рамане ў вершах Яўгена Далматоўскага. Гэта гісторыя людзей, якія зведалі сяброўства, каханне, шчасце, што былі здольныя перажыць складаныя і радасныя дні, прайсці перамогі і страты, але застацца сабой, пры гэтым будучы апорай адно аднаму. Падзеі фільма дазваляюць пранікнуцца атмасферай жыцця цэлага пакалення, якое вынесла на сваіх плячах будаўніцтва першай чаргі Маскоўскага метрапалітэна, змаганне з фашыстамі ў Іспаніі — і ўдзельнічала ў пасляваенным аднаўленні краіны. Стужка стала класікай савецкага кіно і вартая таго, каб яе глядзелі і помнілі.

Выканаўца адной з галоўных роляў Эліна Быстрыцкая ў адным інтэрв'ю згадвала пра здымкі ў «Дабравольцах»: «Я сыграла Лёлю Цяплову, яе вобраз мне блізкі. Метро было нашай агульнай марай. Масквічы марылі, каб у сталіцы з'явілася падземка...» Актрыса настолькі хацела зняцца ў гэтым фільме, што гатовая была нават абрэзаць доўгія валасы, паколькі па сцэнарыі было задумана, што яе гераіня спачатку носіць кароткую стрыжку. Ролю Лёлі Быстрыцкая прысвяціла маме.

А як узнікне жаданне ўспомніць артыстку і больш даведацца пра яе, не прапусціце чарговы выпуск праекта «Легенды кіно», прысвечаны ёй. Разам зможам успомніць фільмы Эліны Быстрыцкай, сярод якіх «Няскончаная аповесць», «Ціхі Дон», «Развітальныя гастролі» і шмат іншых, даведаемся пра закулiссе працоўных будняў вялікай актрысы, яе мары аб сцэне і шлях у прафесію, а таксама дзе актрыса адчувала сябе па-сапраўднаму шчаслівай.

Пра ўсё гэта даведаемся з успамінаў сяброў, блізкіх, калег па цэху вялікай артысткі. Так, яе сяброўка Яўгенія Кузьмінава адзначыла, што «яна была вельмі патрабавальная да сябе і такая ж была і ў зносінах з іншымі людзьмі». І ў кіно, і ў тэатры — усюды актрыса ўмела трымаць марку.



Каб пераканацца ў гэтым і ўбачыць Эліну Быстрыцкую ў яшчэ адной яе яркай ролі, глядзіце канал «Культура», дзе вялікую артыстку згадаюць у нядзелю, 2 красавіка. У эфіры запланаваны паказ фільма «Дачнікі» рэжысёра Барыса Бабачкіна, які выйшаў на кінастудыі «Масфільм» у 1966 годзе. Стужка знятая па п'есе Максіма Горкага і ў яе аснове — спектакль з аднайменнай назвай, які быў пастаўлены ў 1964 годзе на сцэне Малога тэатра. Глядзіце ў эфіры «Культуры» днём.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**


## «Са "Звяздою" — спадручней!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або на I паўгоддзе 2023 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем прасаў Holt HT-IF-010 і суперпрыз — вертыкальны пыласос Deerma DX700S. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 29 красавіка 2023 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або на I паўгоддзе 2023 года. Пасля 30 чэрвеня 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 38 ад 25 лютага 2023 года.



**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4288 ад 15.02.2023 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або I паўгоддзе 2023 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________
*(аддзяленне сувязі)*
**на II квартал або I паўгоддзе 2023 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* ______ *(індэкс)*

**Удачы ў розыгрышы!**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.10** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40** Навіны надвор'я.
**11.00, 12.15 Драма «Аднойчы і назаўжды» (12+).**
**13.05, 15.25 Драма «Ні да сяла, ні да горада...-2» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларускі час.
**18.30, 19.20 Драма «Стэнаграма лёсу» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00** «Генацыд. Без права на жыццё». Мастацка-публіцыстычны фільм (16+).
**22.15 Серыял «След» (16+).**
**23.50** Арэна.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 14.25, 22.45** Тэлебарометр.
**10.05** «Новы дзень» (12+).
**10.30** «Я з вёскі» (12+).
**11.05 Драма «Чалавек з дома насупраць» (12+).**
**14.50** «На тыдзень» (16+).
**15.35** «Аб здароўі: смехам і сур'ёзна». Відэачасопіс (16+).
**16.05** Мультсерыял «Барбоскіны» (0+).
**16.15** «Прыгоды Піллі» (6+).
**17.40 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
